5. Куліковіч, У. І. Гісторыя і сучаснасць беларускай выдавецкай тэрміналогіі / У. І. Куліковіч // Труды БГТУ. — 2013. — №8: Издат. дело и полиграфия. — С. 63–66.
6. Куліковіч, У. І. Выдавецкая справа / У. І. Куліковіч // Беларуская мова. Прафесійная лексіка. Сацыяльна-гуманітарныя навукі: вучэб. дапам. / М. Р. Прыгодзіч [і інш.]; пад рэд. М. Р. Прыгодзіча, У. І. Куліковіча. — Мінск: РІВШ, 2015. — 147–172 с.
7. Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. давед. Беларус. Сав. Энцыклапедыя: рэдкал. У. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. — Мінск: БелСЭ, 1988. — 608 с.

УДК 821.161.3

І. С. Мяцеліца
(ЦДБКМіЛ НАН Беларусі, г. Мінск)

## ПЕРШАЯ КНІГА ПАЭТА: АСАБЛІВАСЦІ СУЧАСНЫХ ДЭБЮТНЫХ ЗБОРНІКАЎ

Разгалінаваная сістэма літаратурнай інстытуцыі, якая рэгулюе шматлікія працэсы ў галіне айчыннага мастацкага слова, у многім спрыяе станаўленню пісьменніцкіх кадраў. У прыватнасці, гэта выяўляецца ў падтрымцы літаратурных дэбютаў. Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму адчувальным мінусам сістэмы для аўтараў-пачаткоўцаў заставалася высокая ступень залежнасці іх творчай будучыні ад цэнзуры, прадыктаванай дзяржаўнай ідэалогіяй. Яскравай ілюстрацыяй служыць гісторыя паэтычнага дэбюту вядомага сучаснага пісьменніка А. Глобуса, наклад першай кнігі якога так і не дайшоў да чытача: «Маю кнігу вершаў «Груд», што рыхтавалася да выхаду ў серыі «Першая кніга паэта», забараніла савецкая цэнзура. Увесь надрукаваны наклад быў знішчаны, за выняткам асобніка, які прыхавалі сабе цэнзары. Я быў у роспачы, бо выдавецкія рэдактары сказалі, што выпусціць сваю кнігу на радзіме я доўга не змагу, а можа і зусім не змагу» [1]. У новым тысячагоддзі пісьменнікі апынуліся ў іншай сітуацыі: змяншэнне ўплыву дзяржавы і пісьменніцкіх арганізацый, даступнасць незалежных пляцовак для друкавання паспрыялі свабодзе аўтарскага выяўлення. Разам з тым сёння захавалася такая форма падтрымкі таленавітай моладзі, як выданне кнігі (у прыватнасці паэтычнай) без укладання аўтарскіх сродкаў, і гэта магчымасць застаецца шырока запатрабаванай пісьменнікамі-пачаткоўцамі.

Гэтай мэце служаць адразу некалькі літаратурных серый («Дэбют», «Маладая паэзія Беларусі», «Мінскія маладыя галасы», «Пункт адліку»). Літаратурны дэбют, як правіла, мае тры этапы: публікацыя вершаў у рэгіянальным перыядычным друку; публікацыя вершаваных падборак у спецыялізаваных выданнях (літаратурна-мастацкіх газетах і часопісах, альманахах, калектыўных зборніках); выхад аўтарскай кнігі (часта на першым і другім этапах выступленні ў друку суіснуюць паралельна з публікацыямі ў інтэрнэце). Традыцыйную схему пісьмен-ніцкага дэбюту ілюструюць аўтары ўжо класічнай серыі «Першая кніга паэта» (выд. «Мастацкая літаратура»), якая была распачата ў 1968 г. і адкрыла ў беларускай літаратуры многа гучных імёнаў. Асаблівасці кніжнага рынку другой паловы XX ст. і высокі чытацкі попыт прадвызначылі выхад дэбютных выданняў вялікімі тыражамі. Так, наклад асобных зборнікаў серыі даходзіў да пяці тысяч асобнікаў (часцей за ўсё сустракаўся тыраж тры і чатыры тысячы, радзей — адна і дзве тысячы экзэмпляраў). Заўважнае змяншэнне гэтага паказчыка адбылося толькі ў 90-х гг., калі колькасць асобнікаў дэбютнай кнігі зафіксавалася на ўроўні каля адной тысячы. Дзякуючы гэтай серыі ў свой час убачылі свет кнігі Я. Янішчыц, А. Пашкевіча, Н. Мацяш, А. Разанава, У. Някляева, Т. Бондар, А. Сыса, Р. Баравіковай і інш. За гады існавання ў серыі выйшла каля 70 аўтараў, для большасці якіх дэбют стаў удалым стартам і прадвызначыў іх далейшы пісьменніцкі лёс.

У 1998 г. «Мастацкая літаратура» распачала новую серыю для пачынаючых аўтараў — «Дэбют»; у 2011 і 2012 гг. да яе далучыліся серыі «Мінскія маладыя галасы» Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і «Маладая паэзія Беларусі» Саюза пісьменнікаў Беларусі; таксама з 2012 г. выходзяць кнігі падсерыі «Пункт адліку» (серыя «Кнігарня пісьменніка» Саюза беларускіх пісьменнікаў) і інш. Усе гэтыя серыі яднаюць, акрамя арыентацыі на падтрымку творчасці маладых аўтараў, і іншыя прыкметы. Так, іх тыражы вагаюцца ў межах 95–500 асобнікаў з перавагай 200–300 экзэмпляраў, выключэнне складае серыя «Дэбют», кнігі якой выходзяць накладам 1000 асобнікаў. Такія лічбы выглядаюць досыць сціпла: невялікі попыт на сучасную літаратуру, у прыватнасці, на паэзію, адбіваецца на колькасці экзэмпляраў і першых аўтарскіх зборнікаў, і наступных паэтычных кніг сучасных пісьменнікаў. Не такой прадстаўнічай з’яўляецца і колькасць аўтараў: кожная з названых серый прэзентавала каля

дваццаці паэтаў (улічваючы гады заснавання серый, можна спадзявацца, што спіс дэбютантаў будзе поўніцца).

Структурна сучасныя дэбютныя зборнікі вельмі блізкія. Як правіла, колькасць старонак у межах канкрэтнай серыі амаль аднолькавая (50–70 с.), кнігі часта ўтрымліваюць вершы ад першага паэтычнага вопыту да часу падрыхтоўкі выдання, традыцыйныя і эксперыментальныя ўзоры лірыкі, што ўплывае на размяшчэнне вершаў у зборніку, колькасць раздзелаў і да т. п. Такое ж падабенства назіраецца і ў афармленні. Асаблівасцю візуальнага вобраза серыйных выданняў з'яўляецца аднастайнасць, якая выяўляецца ў іх фармаце, дызайне вокладкі, вёрстцы і пад. Падчас падрыхтоўкі да друку дэбютнага серыйнага выдання аўтар (за рэдкім выключэннем) не можа ўплываць на такія працэсы, як вёрстка асобных частак тэксту (выходных дадзеных, біяграфічных звестак, рамачных элементаў і пад.) і выбар вокладкі. Тым самым для пісьменніка-пачаткоўца становіцца недаступным фарміраванне візуальнага вобразу кнігі, які, бясспрэчна, уплывае на першасную рэакцыю чытача (так, зборнікі серыі «Першая кніга паэта» доўгі час выходзілі пад вокладкамі, якія адрозніваліся толькі фотаздымкам аўтара і колерам). Зборнікі сучасных серый, хоць і падтрымліваючы выбраны стыль мастацкага афармлення, дэманструюць большую разнастай-насць (серыя «Пункт адліку»), аднак часта значна саступаюць пазасерыйным выданням (для вокладкі некалькіх зборнікаў серыі «Мінскія маладыя галасы» выкарыстаны фотаздымкі з інтэрнэт-сайтаў).

Далёка не ўсе дэбютныя кнігі серый далі старт пісьменніцкай папулярнасці. Найбольшы розгалас і падтрымку крытыкаў, якая выяўляецца і ў станоўчых рэцэнзіях, і ў уключэнні ў шорт-лісты папулярных літаратурных прэмій, атрымліваюць аўтары кніг падсерыі «Пункту адліку». Сярод іх А. Упала, У. Лянкевіч, А. Рудак, Н. Манцэвіч, М. Бараноўскі, А. Арцёмаў. Прыхільнасць да розных жанраў, стыляў, напрамкаў сучаснай паэзіі, выразная аўтарская пазіцыя, нешаблоннасць мыслення маладых творцаў робіць серыю яркай, дзёрзкай і вылучае яе сярод іншых. Аўтары зборнікаў серый «Дэбют», «Мінскія маладыя галасы», «Маладая паэзія Беларусі» у абсалютнай большасці аддаюць перавагу традыцыйным жанрам і формам, спрабуюць паэтычныя сілы ў класічным сілабатанічным вершаскладанні, рэалізуюць творчы патэнцыял у межах ужо засвоеных літаратурай тэм, ідэй, сюжэтаў, рэдка выходзячы за межы паэтычных

традыцый. Побач са знешнімі атрыбутамі такое напаўненне становіцца своеасаблівай прыкметай серый. Разам з тым нямала вядомых імёнаў і сярод паэтаў, чые кнігі выйшлі ў названых серыях. Так, мае свой працяг пісьменніцкі дэбют У. Гарачкі, Т. Сівец, Р. Малахоўскага («Дэбют»), М. Латышкевіч («Мінскія маладыя галасы»), Н. Кудасавай, А. Шостака, («Маладая паэзія Беларусі») і інш.

Такім чынам, сёння ў Беларусі суіснуе некалькі серый кніг для маладых аўтараў, найбольш заўважныя сярод іх — «Дэбют», «Маладая паэзія Беларусі», «Мінскія маладыя галасы», «Пункт адліку». Дэбютныя паэтычныя зборнікі характарызуюцца падабенствам структуры, мастацкага афармлення, тыражнасці. Як найбольш паспяховая і запатрабаваная вылучаецца дэбютная серыя «Пункт адліку», кнігі якой ілюструюць шматвектарнасць і стракатасць сучаснага літаратурнага працэсу.

ЛІТАРАТУРА

1. Глобус, А. Першая кніга / А. Глобус // Жывы часопіс А. Глобуса [электронны рэсурс]. — Рэжым доступу:http://adam-hlobus.livejournal.com/2593649.html. — Дата доступу: 28.06.2017.

УДК 82-97(476.2)

Протоиерей Игорь Ольшанов, настоятель храма
Святого Архангела Михаила в г. Гомеле
(Гомельская епархия Белорусской православной церкви, г. Гомель);
Т. М. Маруняк, заведующая
редакционно-издательским отделом
(БелГУТ, г. Гомель)

## НОВОЕ ИЗДАНИЕ СЕРИИ ПРАВОСЛАВНОЙ ЛИТЕРАТУРЫ ГОМЕЛЬЩИНЫ

Во все времена Православная церковь являлась носителем духовно-нравственных и культурных ценностей славянских народов. В современном изменяющемся мире, отдаляющемся от духовной составляющей, Церковь выстраивает тесное взаимодействие с обществом во всех сферах его деятельности.

Главенствующая роль в распространении информации сегодня принадлежит СМИ, но именно печатное слово остается тем важнейшим механизмом в передаче и научных знаний, и накоп-